**КАРЫ́НФСКІ О́РДАР**, адна з разнавіднасцей антычнага ордара побач з дарычным, іанічным, тасканскім. Мае развіты антаблемент, утвораны ступеньчатым архітравам у выглядзе навісаючых адна над адной пліт — фасцый з вылучаным карнізам, суцэльным фрызам, часам упрыгожаным стужкай барэль-





ефа, прафіляваным карнізам, які падтрымліваецца мадульёнамі і аддзяляецца ад фрыза дэнтыкуламі (сухарыкамі, зубчыкамі). Калона абапіраецца на прафіляваную базу, утвораную торусамі (валікамі) і скоцыямі (увагнутымі элементамі) на плінце (4-вугольнай пліце). Ствол калоны (з канелюрамі або без іх) аддзелены ад капітэлі валікам — астрагалам. Капітэль мае выгляд стылізаванай карзіны з 2 радамі лісцяў аканта (па 8 у кожным радзе), размежаванымі сцёбламі з валютамі; па баках 4-вугольнай абакі — разеткі. У Беларусі стылізаваны К.о. пашыраны ў аздабленні інтэр'ераў каталіцкіх храмаў (касцёлы Божага Цела ў Нясвіжы, Св. Андрэя ў Слоніме) і алтароў (касцёл Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі ў Слоніме) позняга барока, у архітэктуры класіцызму (касцёл Маці Божай Шкаплернай у Мядзелі), ампіру (гал. корпус Бел. акадэміі мастацтваў).

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ